такля. Апранутая ў святочную народную вопратку маладая жанчына, што загінула ад рук фашыстаў, – жонка Снапка, яна вяртала гледачоў у маладосць герояў ткачоўскага твора. З'яўленне ў поўнай ваеннай выпраўцы сябра Снапка Мішулі, які загінуў на вайне, асацыятыўна звязвала гісторыю і сучаснасць.

Некаторыя выразныя сродкі спектакля «Перапалох» застаўлялі гледача задумацца над прычынамі разбуральных вынікаў нашага жыцця. У шэрагу іх вызначаюцца апранутыя ў пастаральна-народную вопратку Гускіна і Качкіна, якія па загадзе Снапка сустракаюць былога дырэктара Музея Вялікай Айчыннай вайны Вераб'я. Паводзіны вяскоўцаў у гэтай сцэне нагадваюць знаёмыя карціны былых часоў – пампезныя сустрэчы начальства хлебам і соллю.

У спектаклі выкарыстоўвалася і асацыятыўна-ўзбуджальная музыка – старажытныя беларускія і сербскія песні сутыкнуліся ў непрымірымым канфлікце з сучаснымі афраамерыканскімі музычнымі апрацоўкамі. Яны дапамагалі гледачу больш востра ўспрымаць праблемы постсавецкай і постсацыялістычнай рэчаіснасці – праблемы жыцця людзей на пераломе тысячагоддзяў.

Прастора і час у спектаклі «Перапалох» існавалі ў непарыўных сувязях і разам з тым іх падзялялі не толькі знешнія межы, але і гістарычныя падзеі. Яны вызначаліся як знешнімі прыкметамі месца дзеяння, так і канкрэтнымі паводзінамі персанажаў п'есы. Героі то ўводзілі нас у мінулае сваё жыццё, то ізноў вярталі да яго ў сучаснасці.

У залежнасці ад развіцця сцэнічнага дзеяння і ўзнікаючых на нашых вачах канфліктаў глядач разам з выканаўцамі роляў дзейнічаў і суперажываў таму, што адбывалася на сцэне. Уздзеянне сцэнічнай прасторы на гледача, яго свядомасць – своеасаблівае люстэрка рэчаіснасці, якое давала падставу для разумення – наступіў час глабальных пераўтварэнняў у свеце і жыцці людзей. Учарашняе засталося ў мінулым. Вяртанне да яго магчыма толькі праз архіўныя дакументы, сямейныя альбомы, творы мастацтва, чалавечую памяць.

УДК 738:903.02(476.7)

**Л. М. Быцко**,
*загадчык аддзела традыцыйнай культуры дзяржаўнай установы культуры «Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр», г. Брэст, Рэспубліка Беларусь*

## ПРАДОЎЖЫМ ЖЫЦЦЁ ПАЛЕСКАЙ «МАМЗЭЛЬКІ»

**Анатацыя.** *У артыкуле расказваецца пра гісторыю старажытнага гараднянскага промыслу і традыцыі ганчарнай вытворчасці з аўтэн-*

*тычнымі элементамі ў вёсцы Гарадная Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Падкрэсліваецца роля міжнародных пленэраў ганчароў у папулярызацыі і захаванні ўнікальнага ганчарнага рамяства.*

**Ключавыя словы:** *цэнтр ганчарства, Гарадная, Заходняе Палессе, захаванне традыцый, міжнародныя пленэры, палеская «мамзэль»**.

**L. Bytsko,**
*Head of the Traditional Culture Department of the Brest regional social and cultural center, Brest, Belarus*

## LET'S EXTEND THE LIFE OF THE PALESIAN MAMZELKA

**Abstract.** *The article tells about the history of the ancient Horadnya trade and traditions of pottery production with authentic elements in the village of Horadnaya, Stolin District, Brest Region. The author emphasizes the role of the International Plein Air Potters in popularizing and preserving the unique pottery craft.*

**Key words:** *pottery, Urban, Western Polessie, preservation of traditions, international plein air, Paleska "mamzel".*

Адно з найстаражытных народных рамёстваў – ганчарства. З гліны рабілі самы разнастайны посуд для халоднага і гарачага прыгатавання ежы і захавання розных прадуктаў: збанкі, гаршкі, кубкі, глякі, слоікі, міскі, цёрлы, спарышы. Ганчарства – адзін з нямногіх відаў беларускага народнага мастацтва, які насіў характар промыслу [4, с. 3].

Гісторыя ганчарнага рамяства ў Беларусі сягае ў глыбокую старажытнасць – у эпоху каменнага веку. У формах вырабаў эпохі неаліту, бронзы, жалеза прасочваюцца асноўныя мадэлі посуду, якія ўстойліва захоўваюцца і ў наступныя тысячагоддзі, а некаторыя захаваліся і да нашых дзён. У канцы XIX – першай палавіне XX ст. на тэрыторыі Беларусі налічвалася каля 300 ганчарных асяродкаў з развітым рамяством, у многіх вёсках на Панямонні і захадзе Паазер'я працавалі адзінкавыя майстры, што абслугоўвалі патрэбы аднавяскоўцаў і бліжэйшага наваколля.

У другой палавіне XX ст. ганчарства прыйшло да заняпаду. З аднаго боку, гэта было вынікам насычэння рынку прамысловай прадукцыяй, з другога – непрадуманай фінансавай палітыкай у адносінах да майстроў-саматужнікаў. У выніку ў 1970-я гг. толькі ў лічаных ганчарных асяродках працавалі адзінкавыя майстры старэйшага пакалення, жорстка прывязаныя да канкрэтнага рынку ды зрэдку запатрабаваныя для ўдзелу ў выставачнай дзейнасці. Пры гэтым асартымент посуду прыкметна

* Мамзэль, мамзэлік – маленькі гаршчок, аб'ёмам 0,5–1 л. Назва бытуе ў в. Гарадная Столінскага раёна.

звузіўся, спрасціліся формы, традыцыйную гліняную цацку ўвогуле перасталі вырабляць.

Да сённяшняга дня захаваўся толькі адзін ганчарны асяродак, дзе даўнія традыцыі рамяства яшчэ жывуць у натуральным і практычна нязменным выглядзе. Гэта Гарадная на Століншчыне [2, с. 123].

Вёска Гарадная Столінскага раёна Брэсцкай вобласці славутая сваім ганчарным промыслам, які бярэ пачатак у XV ст. Першая літаратурная згадка пра Гарадную адносіцца да 1448 г. У мінулым Гарадная мела статус мястэчка і валодала Магдэбургскім правам і ўласным гербам. Багатыя радовішчы гліны і навакольныя лясы, а разам з тым бедная глеба, якая была малапрыдатная для земляробства, малазямелле мясцовых сялян садзейнічалі развіццю ў Гараднай ганчарнага промыслу, які на працягу некалькіх стагоддзяў быў асноўным заняткам мясцовага насельніцтва. Высокія тэхналагічныя якасці гараднянскай керамікі ведалі на ўсім Палессі, у Цэнтральнай Беларусі, трапляла яна і на Валынь, у Кіеў, Вільню, Варшаву. У Вільні гараднянскую кераміку называлі целяханскай (па аналогіі з шырока вядомым целяханскім фаянсам). Уладальнікі ювелірных фабрык ведалі яе высокую тэрмічную ўласцівасць і ахвотна набывалі для выплаўкі каштоўных металаў. Для гараднянскага посуду характэрная тая ж шарападобнасць і чаканенасць форм, што і для керамікі Заходняга Палесся ў цэлым. Разам з тым своеасаблівыя сыравінныя і тэхналагічныя перадумовы выклікалі да жыцця іншыя арнаментальна-дэкаратыўныя і каларыстычныя асаблівасці. Пануе тут ангобная размалёўка чырвонай жалезістай глінай па неглазураванай паверхні, якая пасля абпальвання становіцца крэмава-белай [5, с. 110–111].

Ганчарам вёскі Гарадная Столінскага раёна Брэсцкай вобласці, якія выконвалі гэтыя вырабы, уласціва прыроджанае адчуванне формы і пластычных уласцівасцей матэрыялу. Чырвоны колер роспісу і характар арнаменту выяўляюць аб’ём пасудзін і белізну гліны. Гэтыя прыёмы дэкору склаліся ў даўнія часы і сталі традыцыйнымі для гараднянскай керамікі. У аглядзе саматужных промыслаў Мінскай губерні за 1896 г. указваецца, што ганчары Гараднай атрымалі за свае вырабы 3200 рублёў. Гэта на той час значная сума. У параўнанні з астатнімі паветамі Гарадная зрабіла за год столькі ганчарнага тавару, колькі выраблялася яго ў Слуцкім, Мінскім і Ігуменскім паветах разам [3, с. 10].

У пачатку XX ст. ганчарным промыслам Гараднай займалася больш за 200, а ў 1920–1930-я гг. – каля 500 сем’яў. У гэты ж час гараднянская кераміка ў якасці твораў народнага мастацтва пачала дэманстравацца на выстаўках. У 1911 г. этнограф Ісак Сербаў задакументаваў на фотаздымках працэс мясцовай ганчарнай вытворчасці посуду на ганчарным коле, ганчароў з сям’і Мірановічаў і Яромічаў. У перыяд 1920–1930-х гг. гараднянская кераміка зрабілася прадметам навуковай цікавасці і музейнага калекцыяніравання. У гэты час дзеячы народных промыслаў

у Польшчы рабілі арганізацыйныя намаганні па ўдасканаленні ганчарнай вытворчасці, навучанні майстроў, арганізацыі вытворча-гандлёвых кааператываў.

У 1926 г. у г. Пінску быў заснаваны Палескі музей, дзе ў аддзеле керамікі знаходзіліся вырабы ганчароў з Гарадной. Гараднянскія гаршкі былі распаўсюджаны не толькі на Палессі, але вядомы далёка за яго межамі. Падчас экспедыцыі музея да Гарадной былі набыты ганчарныя прылады і ўзяты пробы гліны, а таксама зроблены шэраг фотаздымкаў, якія адлюстроўваюць працу ганчароў [1, с. 77].

У пасляваенны час ганчарная вытворчасць у Гарадной пачала імкліва скарачацца. Гэта было выклікана забаронай у СССР на індывідуальнае прадпрымальніцтва, высокімі падаткамі, дэмаграфічнымі зрухамі і адтокам маладога пакалення з вёскі ў горад. Не далі плёну спробы Пінскай фабрыкі мастацкіх вырабаў арганізаваць супрацоўніцтва з гараднянскімі ганчарамі ў 1970-я гг. Разам з тым у перыяд 1970–1990-х гг. рамяство гараднянскіх ганчароў было асэнсавана ў якасці набытку нацыянальнай культуры і мастацтва. Вырабы ганчароў Аляксандра Вячоркі, Фёдара Шэлеста, Івана Яроміча, Аўрама Басаўца, Андрэя Кісяля, Івана Гембіцкага дэманстраваліся на шматлікіх выстаўках у Беларусі, Маскве і ў замежжы. У 1992 г. у Беларусі была выпушчана паштовая марка з выявай гараднянскага посуду. На Першым рэспубліканскім свяцеконкурсе «Гліняны звон» у 1996 г. майстрам года быў абраны гараднянскі ганчар Мацвей Пячонка. У 2004 г. патомны ганчар Аўрам Басавец атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва.

Раней у Брэсцкай вобласці існавала 5 буйных цэнтраў ганчарства: Ружаны і Пружаны, Ясянец Баранавіцкана раёна, Пагост-Загародскі Пінскага раёна і в. Гарадная Столінскага раёна. На нашых вачах знікла ганчарства ў гэтых цэнтрах. І толькі гараднянскі промысел існуе ў аўтэнтычным выглядзе. Тут захаваліся традыцыйныя тэхналогіі апрацоўкі гліны, вырабу посуду на нажных ганчарных колах і яго абпальванне. Існуе і мясцовая метралогія – сістэма назваў ганчарных форм.

З канца 1990-х гг. шэраг захадаў па падтрымцы гараднянскага промыслу зрабілі ўстановы культуры Брэсцкай вобласці. У 1997 г. Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр падрыхтаваў відэафільм аб ганчарстве Гарадной «Кола жыцця». У 2003 г. па рашэнні Столінскага райвыканкама ў Гарадной быў створаны Цэнтр ганчарства. Ён размешчаны ў памяшканні Гараднянскага сельскага Дома культуры. Тут рамяству навучаюцца мясцовыя школьнікі, якім ганчарную справу выкладаюць патомныя ганчары.

Столінскім аддзелам культуры пры падтрымцы міжнароднага фонду быў ажыццёўлены праект «Захаванне і развіццё ганчарнага промыслу на тэрыторыі Гараднянскага сельскага савета», які быў накіраваны на падтрымку і развіццё ганчарства праз навучанне рамяству маладога

пакалення, уключэнне гэтага цэнтра ў турыстычныя маршруты. У выніку ў Гараднoй быў набыты дом і створаны дом-музей «Хата ганчара» ў якасці філіяла Столінскага раённага краязнаўчага музея.

У 2008 г. у Гараднoй па ініцыятыве Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра і падтрымцы ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама адбыўся І Міжнародны пленэр ганчароў, які меў на мэце прыцягнуць увагу грамадскасці да праблем захавання і развіцця ўнікальнага рамяства па вырабе рэчаў утылітарнага і дэкаратыўна-прыкладнога прызначэння з абпаленай гліны. Адной з галоўных яго ідэй была падтрымка і ўшанаванне патомных ганчароў вёскі Гарадная. Мясцовыя ганчары Андрэй Мірановіч, Аўрам Басавец, Мікалай Шэлест, Георгій Кавалька, Мікалай Кісель, Арсеній Шэлест і Макар Шэлест сталі ганаровымі ўдзельнікамі І Міжнароднага пленэру. На жаль, з кожным новым пленэрам гэтых майстроў станавілася ўсё менш, і ў апошнім, сёмым, удзельнічалі толькі двое: 86-гадовы Макар Шэлест і 81-гадовы Рыгор Кавалька.

Варта адзначыць, што ў пленэрах удзельнічалі браты Сяргей і Іван Шэлесты, якія прыйшлі ў Цэнтр ганчарства ў 13- і 15-гадовым узросце, авалодалі тэхналогіяй і сакрэтамі ганчарнага промыслу. Нягледзячы на тое, што яны маюць асноўную працу, у ганчарстве дасягнулі поспехаў, сваімі вырабамі, аздобленымі характэрным мясцовым дэкорам, падтрымліваюць і развіваюць традыцыі ганчарнага промыслу.

Для Аляксандра Аўчыннікава, майстра з г. Бабруйска (зараз з сям'ёй жыве ў вёсцы Гарадная), удзел у IV Міжнародным пленэры вырашыў далейшы напрамак дзейнасці. Ганчарства стала для яго асноўным заробкам.

На пленэрах вялікая ўвага надаецца захаванню традыцый гараднянскага посуду, яго форм. Так, на першым пленэры сярод удзельнікаў праходзіў конкурс на выраб «мамзэлькі» (на 1 кг збожжа). Журы, сфарміраванае з патомных гараднянскіх ганчароў, чые бацькі, дзяды і прадзеды круцілі ганчарнае кола, выбіралі лепшыя мамзэлькі, зробленыя прадстаўнікамі розных краін свету. Міжнародны пленэр нібы ўскалыхнуў Гарадную. Гэта падзея цікавіла не толькі ганчароў, іх сем'і, але ўсю мясцовую супольнасць. Людзі з цікавасцю назіралі за працай ганчароў з іншых краін, як ствараліся амфары майстрам Джамала Балаташвілі з Грузіі, нараджаліся танюсенькія кароны ў шведскай керамісткі Монікі Ёхансан. Вакол удзельнікаў пленэру з непадробленай цікавасцю віравалі мясцовыя гараднянскія дзеці, удзельнічалі ў майстар-класах.

У 2010 г. на базе Цэнтра ганчарства прайшоў ІІ Міжнародны пленэр з удзелам майстроў-ганчароў з 8 краін свету. Напярэдадні аддзелам культуры разам з Брэсцкім абласным грамадска-культурным цэнтрам быў напісаны і выйграны праект праграмы «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні» «Прадоўжым жыццё палескай мамзэлькі». У выніку

для Цэнтра ганчарства былі закуплены і ўсталяваны сучасныя шкляныя вітрыны, дзе размешчана калекцыя ганчарнага посуду, выробленага падчас I Міжнароднага пленэру ганчароў. За гэтыя сродкі таксама ўпершыню арганізавана і праведзена свята рамёстваў «Гараднянскі кірмаш», якое атрымала шырокі рэзананс у СМІ. Арганізатары імкнуліся зрабіць у Гарадной пляцоўку, дзе можна набыць кераміку не толькі гараднянскую, але і іншых ганчароў.

Важнай падзеяй гэтага ж года стала паездка ганчароў у г. Скапін Разанскай вобласці (Расія) на IV Міжнародны фестываль ганчароў, дзе майстры атрымалі дыплом «Промыслу, захаваўшаму традыцыі».

Не спыняючыся на дасягнутым, у 2011 г. у Цэнтры ганчарства працягваюцца мерапрыемствы, накіраваныя на захаванне і развіццё ганчарнага промыслу. Галоўнай падзеяй 2011 г. стаў пленэр разьбяроў і мастакоў «Ганчарны промысел у дрэве і жывапісе». Вынікам пленэру сталі манументальныя драўляныя скульптуры, якія цалкам адлюстроўваюць ганчарны працэс ад нарыхтоўкі гліны да перадачы з пакалення ў пакаленне ганчарных навыкаў, а таксама стварэнне партрэтаў апошніх патомных ганчароў, выкананых з натуры ў тэхніцы алейнага жывапісу. Гэтыя партрэты экспануюцца ў Цэнтры ганчарства.

У 2011 г. элемент нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Традыцыі ганчарнай вытворчасці з аўтэнтычнымі элементамі» быў уключаны ў Дзяржаўны спіс НКС.

З гэтага часу ў вёсцы Гарадная адбылося яшчэ пяць міжнародных пленэраў ганчароў (прысвечаны пэўнаму напрамку ганчарства), у якіх бралі ўдзел майстры з 12 краін свету. Трэці быў прысвечаны формам, а шосты ангобнаму роспісу. Удзельнікі пленэраў стваралі і творчыя працы. У выніку ў Цэнтры прадстаўлена музейная экспазіцыя твораў ганчарства і керамікі з розных куточкаў свету, якая прываблівае шматлікіх турыстаў.

Важнай падзеяй для развіцця творчых камунікацый стала арганізаваная ў музеі г. Густаўзберг (Швецыя, 2014) беларуска-шведская выстаўка керамікі «Традыцыі і аднаўленні». Галоўным персанажам яе была «мамзэлька». Гаршчок стаяў на высокім подыуме ў гарманічным асвятленні. Для наведвальнікаў на двух экранах нон-стопам дэманстраваўся фільм пра аднарукага гараднянскага ганчара Мацвея Пячонку, таксама слайды з вёскі Гарадной (ганчары, Цэнтр ганчарства, людзі, краявіды). На выставе былі прадстаўлены творы шведскіх і беларускіх майстроў керамікі.

У наш час становішча ганчарнага промыслу як цікавай галіны народнага мастацтва, якая мае глыбокія карані і багатыя традыцыі, дастаткова складанае. Разгледзім гэту праблему на прыкладзе развіцця аўтэнтычнага ганчарнага рамяства ў в. Гарадной, якое з’яўляецца ўнікальным па былой значнасці, памерах, формах арганізацыі ганчарнага цэнтра.

На сённяшні дзень ганчарствам займаюцца патомныя майстры Макар Шэлест і Рыгор Кавалька. Яны як носьбіты традыцыйных рамесных

ведаў і навыкаў валодаць сакрэтамі тэхналогіі апрацоўкі матэрыялу, мастацкімі прыёмамі стварэння ганчарных форм і іх апрацоўкі. Але зберагчы гэтую ўнікальную традыцыю можна з дапамогай сучасных тэхнічных стродкаў (лічбавае відэа, фота, аўдыя). Важнай праблемай з'яўляецца пошук і прафесійная распрацоўка дзейсных захадаў па захаванні ганчарства ў Гарадной. Цэнтр павінен развівацца не толькі ў форме навучання моладзі, а і стварэння сучаснай вытворчасці ганчарнага посуду на падставе выкарыстання рарытэтнай па захаванасці тэхналогіі, з ужываннем неабходных тэхналагічных удасканаленняў і арганізацыі працы.

Падтрымаць унікальны гісторыка-культурны цэнтр в. Гарадной можна з уключэннем яго ў інфраструктуру рэспубліканскага і міжнароднага турызму. Тут ёсць магчымасць для распрацоўкі этнаграфічнага маршруту. Турысты змаглі б далучыцца да цікавага промыслу, праверыць свае здольнасці, альбо пасядзець за ганчарным колам, паглядзець на працэс абпальвання гліны і г. д. Напрыканцы вандроўкі пакаштаваць бабку з бабачніка, з'есці тушаную бульбу або мяса па-гараднянску з «мамзэліка» і выпіць малака са збана.

Сёння найбольш актуальнымі задачамі для гараднянцаў з'яўляюцца падтрыманне промыслу ў яго натуральным выглядзе з формамі вытворчасці, што склаліся за гады развіцця ганчарства, арганізацыя вучнёўства, працяг традыцый правядзення міжнародных пленэраў ганчароў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. *Лабачэўская, В. А.* Захавальнік Палескага музея Дзмітрый Георгіеўскі: да 75-годдзя адкрыцця музея ў Пінску / В. А. Лабачэўская ; Беларускі ін-т праблем культуры. – Мінск : Тэхналогія, 2001. – 82 с.

2. Народныя майстры Беларусі / склад.: Я. М. Сахута, А. Ю. Лозка ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Рэсп. цэнтр нац. культур. – Мінск : ІВЦ НЗО Мінфіна, 2020. – 300 с.

3. *Паньшина, И. Н.* Музей белорусского народного искусства / И. Н. Паньшина. – Минск : Беларусь, 1983. – 192 с.

4. *Сахута, Я. М.* Беларускае народнае мастацтва / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 1980. – 156 с.

5. *Сахута, Я. М.* Народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск : БелЭн, 1997. – 287 с.